Весці БДПУ. Серыя 1. 2022. № 2. С. 119–122

УДК 811.161.3:[81'373:159.492]

НАМІНАЦЫІ ПРАЯЎ ЭМОЦЫІ СТРАХУ Ў ЛЕКСІЧНАЙ СІСТЭМЕ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ *

А. А. Носік,
саіскальнік кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка

Паступіў у рэдакцыю 14.04.22.

У артыкуле прадстаўлены аналіз лексічнага матэрыялу, які ўжываецца для абазначэння праяў эмоцыі страху. Даецца абагульненая характарыстыка страху, заснаваная на псіхалагічных даследаваннях. Асноўны змест складае апісанне і сістэматызацыя сродкаў намінацыі праяў страху ў беларускай мове. На падставе праведзенага даследавання ўстаноўлены і размеркаваны лексічныя сродкі, ужытыя ў першасным значэнні, а таксама вылучаны групы полісемантаў, якія служаць для ўтварэння другасных значэнняў.

Ключавыя словы: страх, эмоцыі, лексіка, намінацыя, беларуская мова.

The article represents the analysis of lexical material used for denoting the expression of the emotion of fear. It gives a generalized characteristic of fear based in psychological research. The main content presents description and systematization of means of nomination of expressing fear in the Belarusian language. On the base of the conducted research we establish and single out the lexical units used in primary meaning and the groups of polysemants that serve for creating secondary meanings.

Keywords: fear, emotions, vocabulary, nomination, the Belarusian language.

UDC 811.161.3:[81'373:159.492]

NOMINATIONS OF EXPRESSING THE EMOTION OF FEAR IN LEXICAL SYSTEM OF THE BELARUSIAN LANGUAGE

A. Nosik,
Applicant of the Department of Linguistics and Linguodidactics, Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank

Received on 14.04.22.

Страх з'яўляецца адной з фундаментальных эмоцый, якія выклікаюць найбольшую цікавасць у псіхолагаў і прадстаўнікоў сумежных навук. Вызначыць трыгеры страху, яго прыроду, спосабы выражэння, уплыў на фізічнае і псіхічнае здароўе, на сацыялізацыю асобы імкнуліся ў розныя часы навукоўцы ўсяго свету. Даследаваннямі гэтага пытання займаліся К. Ізард, П. Экман, В. Фрайзен, Н. Д. Скрабін, Ч. Дарвін, У. Джэмс, І. П. Паўлаў, І. І. Сечанаў, К. Д. Ушынскі, В. М. Бехцераў, Дж. Боўлбі, Я. П. Ільін і інш.

Паводле Оксфардскага вялікага тлумачальнага псіхалагічнага слоўніка, «страх – гэта эмацыянальны стан, які ўзнікае ў чалавека як рэакцыя на пагрозу ці небяспеку, якой ён не можа пазбегнуць». Як правіла, любое даследаванне рэальнай карціны праяўлення таго ці іншага псіхічнага працэсу пачынаецца з прычыны (прычын) яго ўзнікнення. Так, Я. П. Ільін, спасылаючыся на вывады Дж. Боўлбі, у сваім даследаванні прыводзіць 2 групы прычыны страху: «прыродныя стымулы» (вышыня, боль, адзінота, невядомасць, раптоўнае прыбліжэнне, раптоўнае змяненне стымулу) і «вытворныя стымулы», якія ўзнікаюць на падставе прыродных (цемната, цесната, незнаёмыя прадметы, незнаёмыя людзі, боязь жывёл) [1, с. 164] і залежаць ад канкрэтных сітуацый і асаблівасцей культуры. Ён прытрымліваецца меркавання, што ўсе гэтыя стымулы ўздзейнічаюць намнога мацней, калі ўзнікаюць на фоне адзіноты, якая і сама па сабе з'яўляецца распаўсюджанай прычынай страху.

К. Ізард называе страх найбольш небяспечнай эмоцыяй з усіх, аднак не самай згубнай. Страх можа, на яго погляд, прыводзіць да смерці, але ў той жа час і выступаць сігналам да выратавальных дзеянняў. Ён падзяляе прычыны страху на 4 класы: 1) знешнія падзеі або працэсы; 2) схільнасці і патрэбы; 3) эмоцыі; 4) кагнітыўныя працэсы суб'екта – і ўказвае на тое, што яны могуць быць і прыроднымі, і набытымі [2, с. 315]. Блізкім да страху даследчык лічыць стан трывогі (трывожнасці). Згодна з тэорыяй дыферэнцыяльных эмоцый «трывожнасць складаецца з дамінуючай эмоцыі страху і ўзаемадзеяння страху з адной або некалькімі іншымі фундаментальнымі эмоцыямі, асабліва з *пакутай, гневам, віной, сорамам* і *цікавасцю*» [2, с. 366].

Пытанні ўзаемадзеяння эмоцый знайшлі адлюстраванне ў работах Я. П. Ільіна. Ён размяжоўвае страх і трывогу, якая, на яго погляд, узнікае ў выпадку немагчымасці ажыццяўляць прывычную дзейнасць, а ўласна трывогу ён трактуе як «эмацыянальны стан вострага ўнутранага пакутніцкага беспадстаўнага хвалявання, звязанага ў свядомасці індывіда з прагназаваннем няўдачы, небяспекі ці чакання чагосьці важнага, значнага для чалавека ва ўмовах няпэўнасці» [1, с. 159].

На падставе існуючых поглядаў адбываецца размеркаванне сродкаў намінацыі эмоцый страху ў першасным значэнні, а таксама далучэнне групы полісемантаў, у якіх утрымліваюцца асаблівасці культурных каштоўнасцей, што служыць падставай для ўтварэння другасных значэнняў.

* Артыкул падрыхтаваны пры фінансавай падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (№ ДР 20211211).

ЗРАЗОК

Пры даследаванні лексічнага патэнцыялу ўсіх адценняў і праяў страху актуальным бачыцца погляд В. І. Шахоўскага, які сцвярджаў, што «кагніцыя выклікае эмоцыі, паколькі яна эмацыягенная, а эмоцыі ўплываюць на кагніцыю з прычыны таго, што яны ўключаюцца ва ўсе ўзроўні кагнітыўных працэсаў», адсюль «форма слова, у семантыцы і слоўнікавай прагматыцы якога захоўваюцца веды аб усіх яго псіхалагічных, культурных, сітуацыйных, сігніфікатыўных і іншых экстралінгвістычных рэферэнцыях, а таксама веды аб камунікатыўных моўных (спалучальных і інш.) рэферэнцыях, становіцца статыстычным графічным фіксатарам, які апрадмечвае кангруэнтны эмацыянальны канцэпт і дазваляе ўсім членам дадзенай моўнай групы дыферэнцыраваць адзін эмацыянальны канцэпт ад іншых» [3, с. 21–25].

Канцэптуалізацыя і лексікалізацыя эмоцыі страху ёсць вынік назапашвання і абагульнення вопыту і ведаў, што ствараюць устойлівы эмацыянальны лексічны падмурак для вызначанай моўнай групы людзей.

На падставе матэрыялу, змешчанага ў Тлумачальным слоўніку беларускай мовы, прадставілася магчымым вылучэнне неабходных элементаў лексічнай сістэмы беларускай мовы, у якіх заключана нацыянальная, культурная, матэрыяльная мадэль светабачання і якія выступаюць інтэрпрэтатарамі вербалізаванай інфармацыі аб характары працякання і формах праяўлення комплексу эмоцый страху. Выпрацаваны ў мовазнаўстве вопыт класіфікацыі лексікі паводле розных ЛСП дазваляе ўсталяваць семантычныя сувязі паміж лексічнымі адзінкамі з улікам падабенства некаторых іх ЛСВ, а таксама правесці дыферэнцыяцыю лексікі ЛСП ‘страх’ і ўстанавіць семныя сувязі паміж асобнымі ЛСВ. Дамінантная функцыя заключана ў словах, дзе сема ‘страх’ з’яўляецца пастаяннай і забяспечвае ўстойлівасць сэнсавай структуры.

Намінатыўны корпус ЛСГ назоўнікаў з цэнтральным семантычным кампанентам ‘страх’ складаюць словы *боязь* ‘адчуванне страху, небяспекі’, *баязлівасць* ‘уласцівасць, стан баязлівага’, *жах* ‘моцны страх да знямення’, *жахлівасць* ‘уласцівасць жахлівага’, *жудасць* ‘трывожнае пачуццё страху, прадчуванне бяды, небяспекі; жах; тое, што выклікае страх; трагічная з’ява, жахлівае здарэнне’, *жудаснасць* ‘уласцівасць жудаснага’, *паніка* ‘непераадольны жах і разгубленасць, якія авалодалі чалавекам або мноствам людзей; перапалох, сумятня, выкліканыя гэтым жахам’, *страх* ‘пачуццё і стан вельмі моцнага спалоху; боязь; выражэнне, праяўленне трывогі, неспакою, боязі’, *фобія* ‘неадчэпны, назойлівы страх пры некаторых псіхічных захворваннях’, *запалоханасць* ‘уласцівасць і стан запалоханага’, *запалохванне* ‘дзеянне паводле знач. дзеясл. *запалохваць* – запалохаць’, *пужлівасць* ‘уласцівасць пужлівага; палахлівасць, страх’, *пудлівасць* ‘уласцівасць пудлівага’.

Семантычна блізкімі да папярэдняй групы выступаюць найменні разнавіднасцей і ступеней праяўлення страху: *насцярожанасць* ‘стан насцярожанага’, *насцярожлівасць* ‘уласцівасць насцярожлівага’, *непакой* ‘стан душэўнай трывогі, хвалявання, выкліканы чым-н.’, *трывожнасць* ‘стан трывожнага’, *устрывожанасць* ‘уласцівасць і стан устрывожанага’, *турбота* ‘неспакой’, *устурбаванасць* ‘стан устурбаванага’, *усхваляванасць* ‘стан усхваляванага; хваляванне’, *хваляванне* ‘нервовае ўзбуджэнне, выкліканае адчуваннем трывогі, радасці і пад.’, *узнерваванасць* ‘уласцівасць узнерваванага’, *занепакоенасць* ‘стан занепакоенага; *трывога*, непакой’. ЛСВ полісеманта трывога ‘неспакой, моцнае душэўнае хваляванне, выкліканае страхам, апаскай і пад.’, у семнай структуры якога таксама прысутнічае кампанент ‘страх’, на думку амерыканскага псіхолага П. Экмана, больш падыходзіць для апісання настрою, чым эмацыянальнага стану. Аднак існуюць і іншыя погляды, якія разглядаюць трывогу як складнік комплексу страху (беспрадметны страх). Страх – базавая эмоцыя чалавека, а трывога звязана з чаканнем абстрактнай, уяўнай небяспекі [4].

Моцны страх у сучаснай мове замацаваны ў лексеме *перапуд* ‘вельмі моцны спалох’; стан псіхікі, блізкі да страху або выкліканы ім, адлюстраваны словам *загна́насць* ‘стан загнанага; забітасць, прыніжанасць’. Матэрыяльнае ўвасабленне эмоцыі перадаецца лексемамі *трус* ‘чалавек, які лёгка паддаецца пачуццю страху; баязлівец’, *баязлівец* ‘той, хто ўсяго баіцца, у каго пачуцці страху бяруць верх над іншымі пачуццямі’, *пу́дзіла* ‘пра тое, што выклікае страх, сполах у каго-н.’

Да ліку ядзерных адзінак ЛСГ прыметнікаў адносяцца лексемы *баязлівы* ‘які ўсяго баіцца, нясмелы, палахлівы; які выражае боязь, нясмеласць’, *жахлівы* ‘які выклікае жах, вельмі страшны; роспачны, поўны жаху; вельмі цяжкі, пакутлівы, трагічны’, *жудасны* ‘які выклікае пачуццё страху, чаго-н. непрыемнага, пакутлівага, жахлівага’, *страшны* ‘які выклікае пачуццё страху’, *палахлівы* ‘які лёгка палохаецца, баязлівы; які выражае нясмеласць, прасякнуты баязлівасцю’, *перапуджаны* ‘ахоплены перапудам’, *пужлівы* ‘які лёгка і скора пужаецца; палахлівы; у якім выражаецца страх, спалох; уласцівы таму, хто пужаецца, палохаецца’, *спалоханы* ‘ахоплены страхам, жудасцю’.

Семантыка страху рэалізуецца ў лексемах, якія выходзяць за межы ядзернай прасторы, называючы больш аслабленае ці, наадварот, узмоцненае перажыванне страху, а таксама словы, якія складаюць лік спадарожных эмацыянальнага стану або блізкія да такога: *трывожны* ЛСВ ‘які мае адносіны да трывогі, поўны трывогі, неспакою, хвалявання; які выклікае трывогу, неспакой’, *растрывожаны* ‘якога апанавала трывога, хваляванне; які выказвае трывогу, сведчыць пра трывогу, хваляванне’, *турботны* ‘які турбуецца аб кім-,

ЗРАЗОК

чым-н., клапоціцца пра каго-, што-н.; які адлюстроўвае неспакой, хваляванне', *страшэнны* 'вельмі страшны; жудасны'.

У групе дзеясловаў з першаснай семантыкай 'адчуваць страх, баяцца' цэнтральнае месца займаюць словы *баяцца* 'адчуваць страх; апасацца каго-, чаго-н.; знаходзіцца ў стане трывогі', *забаяцца* 'адчуць боязь, страх; спужацца', *жахацца* 'незак. да *жахну́цца*', *жахну́ць* 'моцна спалохаць, выклікаць жах', *палохацца* 'прыходзіць у стан страху, боязі; баяцца; апасацца чаго-н., трывожыцца', *перапалохацца* 'вельмі моцна спалохацца, напалохацца', *напалохацца* 'адчуць страх, моцна спалохацца', *спалохацца* 'раптоўна адчуць страх, боязь', *запалохаць* 'выклікаць страх, боязь, зрабіць палахлівым, нясмелым', *запалохваць* 'незак. да *запалохаць*', *запалохвацца* 'зал. да *запалохваць*', *пужацца* 'адчуваць страх, палохацца', *напужацца* 'адчуць страх, моцна спужацца; напалохацца', *перапужацца* 'моцна спужацца, напужацца; перапалохацца', *настрашыць* 'навесці, выклікаць страх', *спужацца* 'адчуць страх перад кім-, чым-н.', *спудзіцца* 'адчуць спалох; напужацца, спужацца', *пудзіцца* 'незак. да *пужацца*, *палохацца*', *пудзіць* 'страшыць, пужаць', прыстрашыць, прыпужнуць', *спудзіць* 'напалохаць, спужаць', *пужаць* 'наводзіць страх, палохаць; прымушаць баяцца каго-, чаго-н., страшыць кім-, чым-н.', *пужнуць* 'аднакр. да *пужаць*.

Дыферэнцыяльная сема 'страх' прысутнічае ў слоўнікавых дэфініцыях дзеясловаў *адпужаць* 'пужаючы, прымусіць адмовіцца ад якіх-н. дзеянняў, намераў; пужаючы, прагнаць.', *пудзіць* 'пужаючы, разганяць, адганяць адкуль-н.', *адпудзіць* 'спалохаўшы, адагнаць'; *апасацца* 'баяцца каго-, чаго-н.; непакоіцца з-за магчымасці якога-н. выпадку'; *непакоіцца* 'адчуваць неспакой, трывогу; хвалявацца', *занепакоіцца* 'пачаць непакоіцца', *затрывожыцца* 'пачаць трывожыцца'; *хвалявацца* 'перажываць хваляванне; непакоіцца', *турбавацца* 'хвалявацца, непакоіцца', *уступбавацца* 'прыйсці ў стан непакою, хвалявання, трывогі'.

Першаснае значэнне страху маюць таксама некаторыя культурна абумоўленыя адзінкі, аб'яднаныя агульнай семантычнай тэмай, якія складаюць больш пасіўную частку слоўніка і ўжываюцца з некаторымі стылістычнымі адценнямі: *пужануць* 'тое, што і пужнуць', *жахну́цца* 'прыйсці ў жах, моцна спалохацца', *перапудзіцца* 'перапужацца', *страшыцца* 'адчуваць страх, баяцца каго-, чаго-н.', *збаяцца* 'пабаяцца, спалохацца', *прыпужаць* 'прыстрашыць, прыгразіць чым-н.', *атрупянець* 'вельмі спалохацца, страціць самавалоданне; аслупянець', *аслупянець* 'знерухомець ад моцнага ўзрушэння; анямець ад здзіўлення і інш', *здрэйфіць* 'зак. да *дрэйфіць* (адступаць перад цяжкасцямі, небяспекай; баяцца, губляцца)', *панікаваць* 'паддавацца паніцы, моцна хвалявацца, нервавацца'.

Часам пад уплывам эмоцый чалавеку ўласціва бескантрольнае ўтварэнне рухаў і дзеянняў. В. Ю. Шыманская адзначае, што «назіраючы за паводзінамі чалавека ў час пэўных эмацыянальных станаў, можна ўстанавіць аб'ектыўнае падабенства яго мімікі, жэстаў, псіхаматорыкі і маўлення з тымі, якія характэрны для чалавека з парушэннямі здароўя» [5, с. 58]. Канкрэтнае выражэнне эмоцый страху ў рухах, дзеяннях, змяненнях фізіялагічных паказчыкаў актуалізуецца праз ЛСВ дзеясловаў *халадзець* 'адчуваць холад ад моцнага хвалявання, страху і пад.', *халадзіць* 'агортваць холадам пры моцным хваляванні, страху і пад.', *захаладзець* 'адчуць холад ад уздзеяння якога-н. моцнага пачуцця', *здрыгануцца* 'аднакр. да *здрыгацца*.', *здрыгацца* 'рабіць сутаргавыя рухі, мімаволі уздрыгваць (ад страху, узрушэння і пад.)', *задрыжаць* і *задрыжэць* 'пачаць дрыжаць, дрыжэць', *калаціцца* 'дрыжаць, хістацца, трэсціся; часта, сутаргава ўздрыгваць (пра рукі, ногі, цела і пад.)', самлець 'анямець ад нечаканага страху, здзіўлення і пад.', *трапятаць* 'узмоцнена, часта біцца з прычыны хвалявання, неспакою і пад. (пра сэрца)', *шарахнуцца* 'ад спалоху, нечаканасці і пад. рэзка кінуцца, падацца ўбок'.

Думку пра тое, што ў працэсе пераасэнсавання існуючых намінацый і ўтварэнні другасных вырашальнае значэнне маюць не сістэмна-моўныя сувязі, а веды чалавека пра навакольны свет, выказаў У. А. Звегінцаў. Паводле яго меркавання, кагнітыўныя працэсы развіваюцца на ўзроўні сэнсу, які «вырывае думку чалавека з палону лінгвістычных ведаў» [6, с. 178]. Такога ж погляду прытрымліваецца і В. М. Тэлія і называе дадзены тып значэнняў «сігналізуе аб эматыўных адносінах суб'екта маўлення да азначаемага, а сам выбар слова можа быць кваліфікаваны як маўленчы ўчынак – ён накіраваны на пэўны эфект уздзеяння на адрасата і таму адносіцца да прагматыкі маўлення як дзейнасці, якая аперыруе мовай як інструментам змянення стану спраў у свеце» [7, с. 9]. У складзе лексікі, якая прымяняецца для апісальнай перадачы меры праяўлення страху праз метафарычнае пераасэнсаванне, сканцэнтраваны словы розных ЛСГ (назоўнікаў, прыметнікаў, дзеясловаў).

Семантычныя мадэлі ў ЛСГ назоўнікаў арганізаваны на пераносах значэння з матэрыяльнай сферы на псіхаэмацыянальную. Такім чынам, вылучаюцца наступныя метафарычныя мадэлі актуалізацыі страху: уласцівасці фізічных цел змяняць стан (форму) – недахоп ці ўбыванне энергіі пад уплывам моцнага страху: *акамяненне* 'дзеянне і стан паводле знач. дзеясл, акамянець (стаць нерухомым, замерці; застыць, аслупянець)', *аслупяненне* 'стан паводле знач. дзеясл, аслупянець'; страта адчувальнасці, парушэнне ходу фізіялагічных працэсаў чалавека і жывёл: *аняменне* 'стан паводле знач. дзеясл. *анямець*', *зняменне* 'стан знямелага', *знямеласць* 'стан знямелага', *змярцвеласць* 'стан змярцвелага', *змярцвенне* 'стан змярцвелага', *здранцвенне* 'стан паводле знач. дзеясл,

ЗРАЗОК

здранцвець', *здранцвеласць* 'стан здранцвелага'; паводзіны жывёл: *дзікаватасць* 'уласцівасць дзікаватага'.

Атаясамліванне рэальнасці з вобразнасцю ў межах семантычнай плоскасці эмоцый страху адзначаецца ў невялікай колькасці прыметнікаў. У якасці асноў пераасэнсавання вылучаюцца наступныя семантычныя сферы: адзнака страты адчувальнасці і парушэння механізмаў жыццядзейнасці чалавека, выкліканыя моцным узрушэннем: *абмярцвелы* 'нерухомы, застылы, без жыцця', *амярцвелы* 'які страціў рухомасць пад уплывам чаго-н.'; *абамлелы* 'анямелы, здранцвелы', *змярцвелы* 'нерухомы, застылы, пазбаўлены жыцця', *анямелы* 'застылы ў нерухомасці пад уплывам якога-н. пачуцця', *здранцвелы* 'які прыйшоў у стан нерухомасці, знямення ад моцнага перажывання, страху і пад.', *знямелы* 'пазбаўлены здольнасці гаварыць (ад здзіўлення, страху, нечаканай радасці і пад.); анямелы'; які стаў цвёрдым, прыняў форму чаго-н.: *акамянелы* 'які стаў нерухомым, замёр; застылы, аслупянелы', *аслупянелы* 'які стаў нерухомы ад моцнага ўзрушэння; анямелы ад здзіўлення'; паказчыкі жывёльных рыс: *дзікі* 'нелюдзімы, які дзічыцца, пазбягае людзей', *дзікаваты* 'трохі дзікі'; які ўтварае бесперапынныя кароткія рухі: *трапяткі* 'ахоплены моцным хваляваннем пад уздзеяннем якога-н. пачуцця; усхваляваны; які выражае хваляванне; поўны душэўнага хвалявання'.

Канататыўны кампанент значэння для перадачы страху ў межах дзеяслоўнай групы рэалізуецца праз усталяванне ніжэйназваных спосабаў метафарызацыі: намачыць сябе, разліўшы што-небудзь: *абліцца* 'ахапіцца, напоўніцца (святлом, пахамі, адчуваннямі і пад.)'; перайсці ў іншы фізічны стан: *камянець* 'станавіцца нерухомыя, застылым; мярцвець', *акамянець* 'стаць нерухомым, замерці; застыць, аслупянець', *здранцвець* 'прыйсці ў стан нерухомасці, знямення ад моцнага перажывання, страху і пад.; замерці'; рэзка, раптоўна аддзяліць што-небудзь: *абарвацца* (тут пра сэрца) 'пра раптоўнае адчуванне трывогі, страху'; утвараць рухі: *дрыжаць* 'адчуваць страх, баяцца каго-н.; непакоіцца, рупліва аберагаць каго-, што-н.', *трапятаць* 'моцна баяцца каго-, чаго-н.; быць нясмелым, баязлівым перад кім-, чым-н.'; працэсы змянення або парушэння механізмаў раўнавагі, характэрных для нармальнага функцыянавання сістэм чалавека: *абамлець* 'абмярцвець, анямець, збянтэжыцца ад нечаканага страху, здзіўлення і пад.', занямець 'замерці, абамлець (пад уплывам якога-н. пачуцця)', *абмерці* 'знямець ад нечаканага і моцнага ўзрушэння; спыніцца, замерці (пра сэрца)', *замерці* 'страціць на момант здольнасць рухацца, акамянець пад уплывам якога-н. моцнага пачуцця', *анямець* 'застыць у нерухомасці пад уплывам якога-н. пачуцця; замерці', *знямець* 'страціць магчымасць гаварыць (ад здзіўлення, страху, нечаканай радасці і пад.)'; набываць жывёльныя рысы: *дзічыцца* 'пазбягаць, унікаць каго-н.; быць дзікім', *дзічэць* 'станавіцца нелюдзімым, дзіклівым'; змяніць тэмпературу: *халадзець* 'адчуваць холад ад моцнага хвалявання, страху і пад.', *халадзіць* 'агортваць холадам пры моцным хваляванні, страху і пад', *пахаладзець* 'анямець (ад жаху, страху і пад.)', *схаладнець* 'адчуць холад пад уплывам якога-н. моцнага пачуцця'.

У працэсе моўнай інтэрпрэтацыі псіхалагічнага вопыту становіцца бачным, што на іх лексічнае рашэнне ўплывае важнасць для пэўнай моўнай групы. Аналіз значэнняў – як першасных, так і другасных – дазваляе меркаваць, што ў аснову намінацыі пакладзена псіхафізіялагічная спецыфіка розных паказчыкаў страху. Найменні, якія фарміруюць ядро ЛСП 'страх', прадвызначаны псіхалагічнымі поглядамі на дэтэрмінанты і галоўныя параметры страху. Далейшым шляхам з'яўляецца высвятленне тыпаў галінаванняў прыроды страху: «біялагічны – сацыяльны», «эмпірычны – метафізічны». Канататыўныя мадэлі намінацыі вызначаюцца дастаткова абмежаванай колькасцю шляхоў пераасэнсавання, паколькі галоўным чынам страх выступае блакатарам працэсаў маторыкі, маўлення і мыслення і зрэдку выражаецца ў выглядзе бурнага эмацыянальнага парыву.

Літаратура

1. *Ильин, Е. П.* Эмоции и чувства: учеб. пособие. – 2-е издание. – СПб., 2008. 784 с.
2. *Изард, К.* Эмоции человека / К. Изард ; пер. с англ. – М. : Изд-во Моск. ун-та, 1980. – 440 с.
3. *Шаховский, В. И.* Лингвистическая теория эмоций : монография / В. И. Шаховский. – М. : Гнозис, 2008. – 416 с.
4. *Экман, П.* Я знаю, что ты чувствуешь. / П. Экман ; пер. с англ. – 2-е изд. СПб. : Питер, 2010. – 334 с.
5. *Шыманская, В. Ю.* Метафарычная рэпрэзентацыя псіхалагічнай сферы чалавека ў беларускай і англійскай мовах (на матэрыяле субстантываў) (з электронным дадаткам) / В. Ю. Шыманская. – Мінск : РІВШ, 2016. – 124 с.
6. *Звегинцев, В. А.* Язык и лингвистическая теория / В. А. Звегинцев. – М. : Издательство Московского университета. – 1973. – 274 с.
7. *Телия, В. Н.* Коннотативный аспект семантики номинативных единиц / В. Н. Телия. – М. : Наука, 1986. – 141 с.

References

1. *Il'in, E. P.* Emocii i chuvstva: ucheb. posobie. – 2-e izdanie. – SPb., 2008. 784 s.
2. *Izard, K.* Emocii cheloveka / K. Izard ; per. s angl. – M. : Izd-vo Mosk. un-ta, 1980. – 440 s.
3. *Shahovskij, V. I.* Lingvisticheskaya teoriya emocij : monografiya / V. I. Shahovskij. – M. : Gnozis, 2008. – 416 s.
4. *Ekman, P.* Ya znayu, chto ty chuvstvuesh'. / P. Ekman ; per. s angl. – 2-e izd. SPb. : Piter, 2010. – 334 s.
5. *Shymanskaya, V. Yu.* Metafarychnaya reprezentacyya psihalagichnaj sfery chalaveka w belaruskaj i anglijskaj movah (na materyyale substantyvaў) (z elektronnym dadatkam) / V. Yu. Shymanskaya. – Minsk : RIVSh, 2016. – 124 s.
6. *Zvegincev, V. A.* Yazyk i lingvisticheskaya teoriya / V. A. Zvegincev. – M. : Izdatel'stvo Moskovskogo universiteta. – 1973. – 274 s.
7. *Teliya, V. N.* Konnotativnyj aspekt semantiki nominativnyh edinic / V. N. Teliya. – M. : Nauka, 1986. – 141 s.

ЗРАЗОК